Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, № 4 (109), 2018

*УДК 811.161.3'373'42:821.161.3-1*У.Караткевіч*

Канцэпт лёс у паэзіі Уладзіміра Караткевіча

Д.Д. Паўлавец, А.Д. Паўлавец

Мэта артыкула – прааналізавць асаблівасці ўжывання канцэпта лёс у індывідуальна-аўтарскім разуменні і яго адлюстраванні ў нацыянальнай канцэптасферы. Паказваецца, якія асацыяцыі названага канцэпта ўласцівы для аўтараў розных слоўнікаў беларускай мовы, што семантычны абсяг «лёсу» даволі шырокі і шматзначны. Даводзіцца, што ў ягоных межах апынуліся іншыя канцэпты, злучаныя з ім і адзін з другім, якія патрапілі ў поле ягонага прыцягнення. Гэты відавочна найгалоўнейшы канцэпт утварае шмат новых сэнсаў, выясняе і адкрывае новае светабачанне ў творах У. Караткевіча. Пры гэтым і сам канцэпт развіваецца, мяняюцца яго межы, паняццевы аб'ём, нават сэнс, які нярэдка звязаны з аўтарскім светаадчуваннем, лёсам лірычнага героя.
Ключавыя словы: канцэпт, лёс, нацыянальная канцэптасфера, агульнаўжывальны сэнс, індывідуальна-аўтарскае светаадчуванне, дамінанта лёсу, лірычны герой.

Purpose of the article is to analyze the features of the application of the concept of fate in the individual author's understanding and its reflection in the national conceptual sphere. It is shown what associations of the concept are inherent in the Belarusian language dictionaries of various authors, and that the semantic range of «destiny» is quite broad and multi-valued. It is shown, that within it there were other concepts associated with it and with each other, which fell within the field of gravity. This clearly important concept forms a lot of new meanings. This concept finds out and opens up a new world in the works of U. Karatkevich. At the same time the concept itself evolves, changing its boundaries, the conceptual scope and even the meaning, which is often associated with the author's attitude to the world and the fate of the lyrical hero.
Keywords: concept, destiny, national conceptual sphere, common usage, individual author's world view, dominant fate, lyrical hero.

Сярод канстантаў беларускай моўнай карціны свету вылучаецца канцэпт *лёс*, які выступае рэтранслятарам нацыянальнай культуры, вызначае шкалу каштоўнасцей, светапоглядныя адметнасці нашага этнасу, выконвае вялікую ролю ў адлюстраванні нацыянальнай канцэптасферы. З яго дапамогай выражаюцца паняцці, значныя для ўсіх людзей: доля, шчасце, наканаванне, будучыня ды іншыя. У беларускай мове лексема *лёс* з'явілася вельмі даўно, дзесьці ў канцы 15 ст., яна фіксуецца ў помніках пачатку 16 ст. [1, сс. 7, 41, 42]. Такім чынам, *лёс* адносіцца да ліку старажытных і важных для нашай культуры слоў, якое, нягледзячы на змены ў жыцці грамадства і чалавека, не знікае з культурнай прасторы. У нашым артыкуле мадэль дадзенага канцэпта разглядаецца на падставе лексікаграфічных крыніц, што дае магчымасць убачыць яго асаблівасці, значэнні найбольш частотных лексем, а таксама ў індывідуальна-аўтарскім, паэтычным ужытку. Аналіз слоўнікаў [2]–[6] дазволіў выдзеліць нам такія лексемы і ў агульнамоўным, і ў індывідуальна-аўтарскім ужыванні, як: *доля, жыццё, жэрабя, зорка, будучыня, шчасце, наканаванне, удзел, кон, планіда, рок, фатум, фартуна*. Кампанент *лёс* прысутнічае ў тлумачэнні ўсіх гэтых слоў, выкончваючы функцыю базавай, зыходнай адзінкі.

Апошнім часам у навуковых колах не слабне, а нарастае цікавасць да канцэпталогіі і канцэпту. Пра гэта сведчыць шмат даследаванняў, прысвечаных дадзенай праблеме, якія ахопліваюць кагнітыўную лінгвістыку, псіхалінвістыку, лінгвакультуралогію, літаратуразнаўства і іншыя навукі. Гэта пацвярджае думку пра актуальнасць і навуковую значнасць акрэсленага аспекту. «Канцэпт – гэта важная інфармацыя, якая захоўваецца ў індывідуальнай або калектыўнай памяці і валодае пэўнай каштоўнасцю, гэта перажываная інфармацыя» [7, с. 128]. Таму зварот да таго або іншага канцэпта прадукцыйны і павучальны. Праўда, пры гэтым неабходна памятаць, што «кожная высокаразвітая мова мае шэраг слоў, акружаных глыбокай таямніцаю: лёс, рок, выпадак (здарэнне), прадвызначэнне. Ніводная гіпотэза, ніводная навука ніколі не зможа дакрануцца да таго, што мы адчуваем, калі заглыбімся ў сэнс і гучанне гэтых слоў. Гэта – сімвалы, але не паняцці» [8, с. 273]. Як і ў культурах іншых народаў, канцэпт 'лёс', бадай, адзін з найгалоўнейшых канцэптаў беларускай культуры. Мусім зазначыць, што названы канцэпт прыцягваў і прыцягвае ўвагу

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

даследчыкаў розных краін і розных галін ведаў, якія разглядаюць яго з лінгвакультуралагічнага і філасофскага бакоў, вызначаюць яго месца ў нацыянальнай моўнай карціне свету. Сапраўды, лёс – гэта найгалоўнейшая катэгорыя свядомасці, пры дапамозе якой будуецца канцэптуальная карціна свету народа. Лёсам валодаюць усе: людзі, рэчы, з'явы, падзеі. У Тлумачальным слоўніку беларускай мовы за лексемай лёс першым замацавана значэнне хады падзей, якія складваюцца незалежна ад волі чалавека; збегу акалічнасцей. Такім чынам падкрэсліваецца яго звышнатуральнае паходжанне. Па-другое, лёс – гэта доля; па-трэцяе, – развіццё чаго-н.; далейшае існаванне, будучыня [3, с. 41].

Аўтары «Беларускай энцыклапедыі» ў сваю чаргу сцвярджаюць, што «лёс, у міфалогіі, ірацыяналістычных філасофскіх сістэмах, паўсядзённым усведамленні незразумелая, недаступная розуму, загадкавая прадвызначанасць падзей і ўчынкаў… у звычайным жыцці лёс азначае долю, жыццёвы шлях, збег абставін» [3, с. 231]. Як бачна, тут *лёс* інтэрпрэтуецца найперш як абстрактнае паняцце, як дзеянне звышразумовае, неспазнанае, таямнічае, як вобраз цёмнага пачатку, затым як нешта лагічна не вытлумачальнае, вышэйшае за інтэлект, нейкая несвабода, вынік учынкаў чалавека, нарэшце, як жыццё, збег абставін.

«Міфалагічны слоўнік» разглядае лёс як «“персаніфікацыю незалежнага ад волі чалавека ходу падзей, вырашальны збег акалічнасцяў, долю”…”можна меркаваць, што архаічны спосаб “сляпога” выбару-кідання, цягання, вылічэння, выбірання лёсаў (жараб'ёўка) і бачанне ў гэтым працэсе грознай праявы нейкіх надпрыродных сіл спрадзіла ўяўленне пра лёс як прадвызначанасць, долю, наканаванасць» [4, с. 288–289]. Такім чынам, з прыведзенага вышэй можна канстатаваць, што лёс – гэта нешта непазбежнае, прадвызначанае, недаступнае розуму і волі чалавека, загадкавае.

Не заглыбляючыся ў сэнсава-філасофскую напаўняльнасць адзінкі, лексіколагі выбудоўваюць сінанімічныя рады, дамінантай якіх выступае *лёс*. Так, М.К. Клышка змяшчае ў гэты сінанімічны рад семы доля, жыццё, наканаванасць, наканаванне (разм.); планіда, зорка, латарэя, кон (перан.); жытка (разм.) [5, с. 166]. С.М. Шведаў у адным шэрагу з лёсам ставіць словы фартуна, фатум, боская воля (царк.), доля, будучыня [6, с. 192]. На жаль, беларусы дагэтуль не маюць нацыянальнага філасофскага слоўніка, таму цяжка гаварыць, што ўкладваюць у паняцце лёс айчынныя філосафы.

Такім чынам, дадзеныя слоўнікаў дазваляюць сцвярджаць, што канцэпт «лёс» асацыіруецца ў свядомасці носьбітаў беларускай мовы з іншымі канцэптамі, матываванымі сіламі лёсу. Слоўнікавыя дэфініцыі паняцця «лёс» сведчаць пра неадназначнасць яго разумення носьбітамі мовы, што абумоўлена найперш яго эміпірычным характарам. Важна тое, што ў канцэпце *лёс* падкрэсліваецца момант прынцыповай незалежнасці волі чалавека ад яго пазіцыі ў адносінах да жыццёвых абставін і непазнавальнасці дэтэрмінавальных сіл лёсу, якія нараджаюць боязь, жах, яго наступствы. Лёс неадольны, таму што ён успрымаецца нашымі продкамі як бязлітасны, жорсткі або спагадлівы, зайздросны.

Звернемся да гэтага, аднаго з найбольш значных і складаных канцэптаў нацыянальнай моўнай карціны свету і прааналізуем яго ў аўтарскай (караткевічаўскай) і народнай канцэптасферы беларускай мовы, памятаючы пра тое, што «ідэя лёсу патрабуе жыццёвага досведу, а не навуковага вопыту, сілы сузірання, а не калькуляцыі, глыбіні, а не розуму» [8, с. 273].

У. Караткевіч, аддаючы перавагу лексеме *лёс*, выкарыстоўвае яе як у ідэнтыфікуючай, так і ў ацэначнай, метафарычнай функцыі. Даволі часта канцэпт *лёс* у паэзіі У. Караткевіча знітаваны з каханнем. Зрэшты, гэта зразумела: каханне ёсць кніга душы, багатая на эмоцыі, пачуцці, незвычайныя павароткі. Лірычна-інтымным настроем прасякнуты радкі аднаго з першых вершаў «Зімняя элегія», у якім, мусіць, згадваючы пра сваё студэнцкае каханне, ён малюе прывабны вобраз сваёй дзяўчыны, пра якую піша:

Былі ў яе нябачаныя вочы,
Падобныя на просінь у нябёс,
І сарамлівасць мілая, дзявочая,
І светлая была, як светлы лёс [9, с. 48].

Каб вылучыць дзявочую чысціню, цнатлівасць, нясмеласць, паэт выкарыстоўвае эпітэт *светлы*, аб’ядноўваючы лёс у адно цэлае з дзявочай, светлай сарамлівасцю, просінню нябёс.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

У вершы «Я іду лугавою дарогай…» У. Караткевіч параўноўвае лёс з «лугавою дарогай, пакручастай і цёмнай». Алюзія лёсу з дарогай заснавана на народных уяўленнях пра тое, што дарога ўвасабляе сувязь са светам памерлых, прадказвае штосьці нечаканае:

Я іду лугавою дарогай,
Пакручастай і цёмнай, як лёс (с. 164).

У вершы «Песня колаў» лёс – гэта адначасова нешта пагрозлівае, папераджальнае і штосьці не вельмі прыемнае з недалёкага мінулага:

Ноч, як лёс, дамам пагражае
Цёмнай злівай, слатой, тугой.
У неба іскры ўзлятаюць, як слёзы,
І, калі мой цягнік закрычыць,
Застаешся ты з ноччу і з лёсам
На чужым, непатрэбным плячы (с. 170).

Семантыка-сінтаксічная дамінанта лёсу тут актуалізуецца з дапамогай назоўнікаў *зліва, слата, туга*. Гэта расчараванне, абумоўленае разрывам з каханай, якая пайшла да другога. Можна сказаць, што У. Караткевіч тонка бачыць побытавыя сцэны, умее схапіць саму сутнасць жыццёвага ўладкавання.

У вершы «О вясна! Таполі! Свеце мілы!...», прысвечаным былому каханню, ён звяртаецца да выразу *жыць у залатой клетцы,* які звычайна ўжываецца ў дачынені да жанчыны, якая прамяняла каханне да «маладога звонкага шпака» на багацце, абрала жыццё ў залатой клетцы, не маючы волі, свабоды. Кожнай жанчыне, якая любіць грошы і шыкоўнае багатае жыццё, здаецца, што «залатая клетка» – гэта і ёсць шчасце. Аднак што гэта такое на самой справе «залатая клетка»? Гэта клетка для птушкі, якую кормяць і пояць, але на свабоду не выпускаюць. Дык хіба магчыма шчасце ў такой, хоць і залатой, клетцы? Тут паэт глядзіць на свет вачыма народа, тым поглядам, які накіроўваецца калектыўным уяўленнем, адлюстраваным у наступных народных выслоўях: *Лепш на волі на голай ветцы, чым у няволі ў залатой клетцы. Лепш на свабодзе ў каморцы, чым у няволі ў залатой клетцы.* (Прынамсі, пазней, быццам доўжачы гэтую думку, вуснамі адной з гераінь «Каласоў…», У. Караткевіч сцвердзіць: *Жаночы лёс аднолькавы і ў пані, і ў прыгоннай*).

Няма ў душы маёй праклёнаў,
Няма на веях цяжкіх слёз…
Заставайся ў клетцы залачонай,
Ты сама абрала гэты лёс (с. 177).

Заўважце, паэт пры гэтым паводзіць сябе па-шляхетнаму: не наракае на зроблены дзяўчынай выбар, не раскрываючы патаемную прычыну яе ўчынку. Адначасова ён не шкадуе пяшчотных слоў, называючы яе «мой забыты, мой апошні светач», і з недаўменнем пытаецца: «Як магла застацца ты ў кайданах?» Ён падкрэслівае, што залатая клетка – гэта нявольніцкія кайданы. Лірычны герой не разумее, чаму гераіня адмовілася «ад палян, дзе месяц закаханы песні “сноў” блакітныя ўзрасціў?» Тут каханне «раскрываецца ва ўзнёслым пакланенні і абагаўленні каханай, рамантычным услаўленні лучнасці закаханых сэрцаў, іх вернасці. Лірычны герой паэта зведаў не толькі шчасце. Але пакуты кахання, аднак ён ніколі не здольны праклясці гэтае пачуццё, тую жанчыну, што прынесла душэўны боль і мукі. Наадварот, шчыра даруе і нават моліцца за яе каханне» [10, с. 189].

З тэмай кахання звязаны сэнс канцэпту *лёс* і ў вершы «Я чакаў цябе тысячу год…». Аўтару здаецца, што здзейснілася ягоная тысячагадовая мара: яна [каханая] прыйшла, але ў яе вачах застылі «холад і лёд», а «сэрца – непрыступная скала». Аднак гэта не бянтэжыць паэта, ён з цвёрдай перакананасцю даводзіць:

Растаплю я твае снягі,
А іначай – лёс, як свінец,
Сконы радасці і тугі,
І канец. Сапраўды… канец (с. 202).

Як падаецца, Краткевіч наўмысна параўноўвае лёс са свінцом, бо добра ведае, што свінец – таксічны метал, у выніку выкарыстання якога забруджваецца навакольнае асяроддзе. Ён шкодна ўздзейнічае на разнастайныя сістэмы чалавечага арганізма і спрыяе пагаршэнню здароўя

РЭПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

людзей, становіцца прычынай смерці. Сведкамі таго, што гэта так, мы сталі пасля катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, вынікі наступстваў якой будуць яшчэ доўга спадарожнічаць насельнікам Беларусі. Не выпадкова ў гэтых радках *лёс-свінец* – пахавальнік радасці і тугі, прычына смерці.

Па меры таго як яго паэзія становіцца ўсё больш і больш спелай, У. Караткевіч грунтуецца на тым, што існуюць не толькі асобасныя, а звышасобасныя, надасобасныя ўзаемасувязі, што ёсць род і народ, радзіма і маці, каханая і каханы. Гэтыя ўзаеміны, узаемазалежнасць становяцца ўсё шырэйшымі. Прыкладам таму сацыяльна-грамадскае, філасофскае гучанне тэмы лёсу ў вершы «Нараканні Насрэдзіна Ахмет-Аха эфендзі». У радках твора праз адмысловы мастацкі ракурс *лёс-бізун* паэт асуджае беларускую пакорнасць і адначасова выказвае любоў, спагаду да свайго народа. У гэтым кантэксце аўтар паглыбляе лексічнае значэнне поля лёс, актуалізуе яго з дапамогай семы *бізун*, які ў беларускім фальклоры валодае дадатковым асацыятыўным адценнем сімвала грубай сілы, прымусу:

Што горды здзек, што вольнай песні ўзлёт
Для чарады, чый лёс – бізун агідны.
Як мне любіць такі народ?
Няшчасны мой…
Улюбёны…
Ненавідны…; (с. 210).

Паэт будуе сваю выснову на тым, што ёсць народ, з якога ён выйшаў, які ён любіць і хоча бачыць яго вольным. Сказанае ім пра свой народ вельмі грунтоўнае, выпакутаванае, ён хоча бачыць свой народ не бязвольнай маўклівай чарадой, падпарадкаванай брутальнай сіле. Для паэта сіла духу і душы, чэсць і свабода – каштоўнасці высокага існавання.

Працяг размовы пра беларускую абыякавасць да свайго лёсу знаходзім у вершы «Шляхі Ігната Буйніцкага». Лірычны герой верша пакліканы гісторыяй слугаваць свайму народу, які, аднак, не заўсёды ўспрымае тое, што робіць Буйніцкі. Адсюль словы непаразумення:

Што ім іхні лёс ,
Вялікі і суровы?
Што ім, – мо ўжо адкажаш нарэшце ты, –
Да загнанай, забітай, задушанай мовы,
Іх вялікасць першы вандроўны артыст?.. (с. 252).

Тут лёс народа ўзаемазвязаны з лёсам мовы, для паэта, як і для Буйніцкага, было зразумела: ёсць мова – ёсць народ, ёсць зямля бацькоў. Такім чынам моўны і духоўны пачаткі, як калісьці ў Ф. Багушэвіча, зліваюцца ў адно цэлае.

У паэме «Зямля дзядоў» падкрэсліваецца ўзаемасувязь няпростага лёсу беларусаў з лёсам славян, з іх уменнем працаваць і кахаць, любіць і бараніць сваю зямлю, з барацьбой супраць заваёўнікаў:

Я ведаю, цяжкімі будуць годы,
А нам стаяць не гнуцца, як трысцё,
Бо лёс славян і лёс майго народа –
Нялёгкае і гордае жыццё (с. 317).

Захапляючыся веліччу горнага крымскага ўзвышша Чатырдага, Караткевіч параўноўвае яго з прастолам багоў, Хрыста:

Ты сам той дзень, уцёс.
Ты зараз цень яго. Ты вечнасць, лёс (с. 194).

Суперажыванне за няспраўджанае шчасце – асноўны змест верша «Нявесце Каліноўскага», якая стала ўдавою, «не пабачыўшы жаніха»: яе надзеі абарвала пятля палача:

І чамусьці ў сэрцы, як рану,
Я нясу твой нязбыты лёс,
Не даруючы ўсім тыранам
Непралітых табою слёз (с. 234).

Так паэт выказвае сваё спачуванне «Марысьцы чарнабровай», суперажывае разам з ёй за няздзейсненыя спадзяванні на шчаслівае жыццё з каханым чалавекам, абарванае бязлітаснай пятлёй ката.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Цікава, што У. Караткевіч, выдатны знаўца старой мовы, ні разу не ўжыў такіх яркіх, характэрных для высокага стылю мовы сінонімаў *лёсу*, як *рок*, *кон*, няма ў яго паэтычнай мове і *наканавання, будучыні, шчасця* ў аналагічным ужытку. Толькі некалькі разоў ён выкарыстоўвае як сінонім агульнаславянскую адзінку *доля*:

Хай шлях даўгі ты не дасі мне, доля.
Зрабіўшы ўсё і дзён спыніўшы бег,
Спакойна потым лягу я, як поле,
Пад чысты і халодны зімні снег.

(На пачатак «Каласоў пад сярпом тваім…» с. 218).

І табе – хай нас людзі рассудзяць –
Я зайздроснай аддзякую доляй:
Ты – ніколі – мяне не забудзеш,
Ты мяне не пабачыш ніколі.

(У бездарожжа для тых, каму шчасціць... с. 275).

У абодвух выпадках паэт апелюе да асноўнага значэння семы доля – да *лёсу*.

У мове У. Караткевіча *лёс* можа быць адвечны, крылаты, надзвычайны, нязбыты, няўмольны, светлы, усяўладны, чорны.

З вышэйразгледжанага бачна, што семантычны абсяг лёсу даволі шырокі і шматзначны. У ягоных межах апынуліся іншыя канцэпты, злучаныя з ім і адзін з другім, дзякуючы таму, што патрапілі ў поле ягонага прыцягнення. Гэты відавочна найгалоўнейшы канцэпт утварае шмат новых сэнсаў, выясняе і адкрывае новае светабачанне ў творах паэта. Пры гэтым і сам канцэпт развіваецца, мяняюцца яго межы, паняццевы аб’ём, нават сэнс, які нярэдка звязаны з аўтарскім светаадчуваннем, нарэшце, лёсам лірычнага героя. Асацыятыўна-вобразны рад лёс – каханне – жыццё – дарога – вечнасць – народ – мова – трагедыя, смерць пабудаваны Караткевічам паводле прынцыпу ўнутранага псіхалагічнага збліжэння і вызначаецца разгорнутым кантэкстам. Як бачым, паэт выкарыстоўвае найбольш істотныя для нашай культуры сэнсавыя значэнні канцэпта, якія падтрымліваюцца і захоўваюцца ў нацыянальнай моўнай карціне. Ён умела вылучае нагалоўнейшыя адметнасці лёсу – вобразную, паняццевую, каштоўнасную. З разгледжанага матэрыялу вынікае, што даследаваны канцэпт у ягонай мове абапіраеца на «лінгвакультуралагічнае поле – іерархічную сістэму адзінак, якія валодаюць агульным значэннем і адлюстроўваюць сістэму адпаведных паняццяў культуры» [11, с. 60].

Малюнак 1 – Семантычнае поле лёсу (паводле слоўнікаў)

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Малюнак 2 – Асацыятыўнае поле лёсу (паэзія Караткевіча)

Літаратура

1. Гістарычны слоўнік беларускай мовы / Склад. Т.І. Блізнюк [і інш.] ; Пад рэд. А.М. Булыкі. – Мн. : Беларуская навука, 1998. – Вып.17. Леснічій – Местскій. – 365 с.

2. Тлумачальны слоўнік беларускай мовы : у 5 т. – Мн. : БелСЭ, 1979. – Т. 3. – 672 с.

3. Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. – Мн. : БелЭн, 1989. – Т. 9. – 560 с.

4. Беларуская міфалогія : энцыклапедычны слоўнік. – Мн. : Беларусь, 2004. – 592 с.

5. Клышка, М.К. Слоўнік сінонімаў і блізказначных слоў / М.К. Клышка ; Пад рэд. Л.А. Антанюк. – 2-е выд., выпр.і дапоўн. – Мн. : Вышэйшая школа, 1993. – 445 с.

6. Шведаў, С.М. Слоўнік сінонімаў беларускай мовы / С.М. Шведаў – Мн. : Сучаснае слова, 2004. – 480 с.

7. Карасик, В.И. Языковой круг: личность, концепты, дискурс / В.И. Карасик. – М. : Гнозис. 2004. – 392 с.

8. Spengler, O. Der Untergang des Abendlandes. Umrisse einer morphologie der Weltgeschichte / O. Spengler. – C.H. Beck'sche Verlagsbuch – Handlung. München, 1920. – B. 1. Gestalt und Wirklichkeit. – 615 s.

9. Караткевіч, У. Збор твораў : у 8 т. / У. Караткевіч. – Мн. : Маст. літ., 1987. – Т. 1. Вершы, паэмы / Аўт. прадм. В. Быкаў. – 431 с., 4 л. іл.

10. Бельскі, А.І. Вывучэнне творчасці пісьменнікаў : класікі і сучаснікі ў школе / А.І. Бельскі – Мн. : Аверсэв, 2005. – 352 с.

11. Воробьев, В.В. Лингвокультурология (теория и методика) : монография. / В.В. Воробьев – М. : Изд-во Рос. ун-та дружбы народов, 1997. – 332 с.

Гомельский государственный
университет им. Ф. Скорины

Поступила в редакцию 27.05.2018

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ